2. Тишков В.А. Забыть о нации (пост-националистическое понимание национализма) // ВФ. 1998. № 9. С.3-26.
3. Зудин А.Ю. Истоки перемен. Культурная трансформация позднесоветского общества// Мировая экономика и международные отношения. 1999. № 4,5.
4. Глушаков В.Е. Вызов времени: Беларусь на пороге тысячелетий. Мн.: Белбизнеспресс, 1999. С.77.
5. Очерки истории науки и культуры Беларуси IX-нач. XX веков / П.Т.Петриков, Д.В.Карев, А.А.Гусак и др. – Мн.: Навука і тэхніка, 1996. С.4.
6. Леви-Строс К. Структурная антропология. – М.,1983. О соотношении сознательного и бессознательного. – С. 161
7. Иноземцев В.Л. Современный постмодернизм: конец социального или вырождение социологии? //ВФ.1998. №9. С.27.
8. См.: публикации в ж. «Свободная мысль»,1996; ВФ. 1998 №9. 1999 – 5 и др.
9. Костина А.В. Массовая культура как феномен постиндустриального общества. Изд.2-е, перераб. и доп. М., 2005. С.5-6.
10. Зверева Г.И. Роль познавательных «поворотов» второй половины XX века в современных российских исследованиях культуры /Выбор метода: изучение культуры в России 1990-х годов. М.,2001.; Перлов А. Представления об «исследовательской свободе» в самоописании российских культурологов // www.iek.edu.ru/
11. Манхейм К. Диагноз нашего времени. М.:Юрист, 1994. С.10.
12. Моисеева Н.А. Сороковикова В.И. менталитет и национальный характер (о выборе метода исследования) // СОЦИС, 2003. № 2.
13. Каган М.С. Классификация и систематизация // типы в культуре. – Л.: ЛГУ, 1979. С.11.

## РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ СКУЛЬПТУРЫ ЯК ПАКАЗАЛЬНІК ТРАНСФАРМАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ У КУЛЬТУРЫ

В.М.Папко
*Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт, г. Брэст, Беларусь*

Савецкае мастацтва з 30-х гг. XX ст. афіцыйна развівалася ў рэчышчы сацыялістычнага рэалізма, што наклала свой адбітак на развіццё ўсіх відаў мастацтва. Гэта значна звузіла разнастайнасць формаў у творах, абмяжоўвала творцаў. У скульптуры гэта прывяло да панавання невялікай колькасці дазволеных тэмаў. Часцей за ўсё помнікі ўвасаблялі дзеячоў рэвалюцыйнага руху, герояў Вялікай Айчыннай вайны, перадавікоў вытворчасці. Амаль не было на Беларусі да к. 80-х гг. помнікаў, якія б былі прысвечаны іншым падзеям гісторыі.

Склаўся стандартны падыход фарміравання гарадской прасторы. У цэнтры кожнага горада — ад сталіцы рэспублікі да раённага цэнтра размяшчалася плошча Леніна, на якой абавязкова стаяў помнік Леніну. Іншыя помнікі і бюсты не адрозніваліся разнастайнасцю. У скульптурным аздабленні гарадоў амаль не падкрэслівалася мясцовая спецыфіка, рэгіянальная гісторыя. Такое скульптурнае аздабленне нівеліравала самабытнасць гарадоў, вяло да страты іх асабістага твару. З канца 80-х гг. аблічча беларускіх гарадоў пачало актыўна змяняцца. Працэс агульнай дэмакратызацыі грамадства станоўчым чынам адбіўся на мастацтве. Беларускія мастакі атрымалі свабоду творчасці, нічым не абмежаваны выбар тэм, жанраў, тэхнік жывапісу. Беларускае мастацтва паступова ўключалася ў агульнаеўрапейскія і сусветныя працэсы, атрымліваючы новыя імпульсы для свайго развіцця.

Дзяржава адыгрывае пэўную ролю ў мастацкім жыцці краіны. Асабліва важная роля дзяржаўных улад у развіцці манументальнай скульптуры, якая патрабуе ўкладання вялікіх сродкаў, дазволу мясцовых улад на ўстаноўку помнікаў. У другой палове 80-х гг. адбываўся працэс аслаблення ідэалагічнага ўціску дзяржавы на мастацкае жыццё. У часы перабудовы, як і раней, вызначальную ролю ў закупцы твораў для музеяў і галерэй адыгрывала мастацка-экспертная камісія па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва міністэрства культуры БССР. Новым у яе дзейнасці была падтрымка твораў гістарычнай тэматыкі, прысвечаных *дакастрычніцкаму перыяду беларускай гісторыі, але большасць твораў складалі па*ранейшаму тыя, што прысвечаны Вялікай Айчыннай вайне.

Рашэнне аб творах манументальнай скульптуры прымалася Дзяржаўным мастацка-экспертным саветам міністэрства па манументальным мастацтве. У 1985 г. на некалькіх пасяджэннях савета абмяркоўвалася рабочая мадэль абеліска "Мінск – горад–герой" скульптара В.Занковіча, мадэлі помнікаў У.Леніна для г. Маларыта (скульптар Н. Кандрацьеў, архітэктарам Ю.Шпіт) і для г. Барысава (скульптар А.Анікейчык, архітэктары Л.Левін і Ю. Градаў) [2, 1-14].

Стварэнне і ўстаноўка твораў манументальнай скульптуры знаходзілася пад пільнай увагай з боку ЦК КПБ. У сярэдзіне 1980-х гг. у абласцях праходзіў працэс аднаўлення і рэстаўрацыі скульптурных помнікаў і манументаў. Савет Міністраў БССР прыняў 1 кастрычніка 1984 г. пастанову "Аб фактах грубых парушэнняў заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры". Быў складзены "Перспектыўны план рэстаўрацыі і замены нізкамастацкіх помнікаў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы на тэрыторыі Брэсцкай вобласці на 1986 – 1990 гг." Планавалася замяніць 23 помнікі, якія лічыліся нізкамастацкімі (напрыклад, абеліск на брацкай магіле савецкіх воінаў у г.п. Шарашова Пружанскага раёна) [7, 102-113].

У гэты перыяд працягвалася абмеркаванне пытанняў, звязаных з ленініянай і стварэннем праектаў помнікаў В.І.Леніну, можна нават заўважыць некаторую актывізацыю дзейнасці мясцовых улад у гэтым накірунку. Працэдура ўзгаднення рашэння аб устаноўцы ці рэканструкцыі помніка адбывалася наступным чынам. Абласны камітэт КПБ звяртаўся ў Міністэрства культуры, а потым у ЦК КПБ накіроўвалася прапанова аб узвядзенні ці рэстаўрацыі помніка ад імя абкома КПБ і Міністэрства культуры. Вызначальнае рашэнне прымалася на бюро ЦК КПБ, які прызначаў і адказных за ўзвядзенне помніка ў адпаведных структурах (абкомах КПБ, міністэрстве, Саюзе мастакоў і Саюзе архітэктараў). Само Міністэрства культуры адказвала толькі за мастацкі бок помніка, абірала выканаўцаў праекта. У 1985-1987 гг. узводзілася значна менш помнікаў Леніну, чым, напрыклад, у 60-70 гг. ХХ ст. У 1985 г. іх устанавілі ў Маларыце і Чэрыкаве, у 1986 г. у Барысаве, у 1987 г. у гп. Беразіно, Гродна, Оршы, Драгічыне, Мядзелі. Для параўнання, у 1970 г. на Беларусі былі ўстаноўлены 34 помнікі і бюсты В.І. Леніна [10, 15-16].

У сакавіку 1988 г. бюро прыняло пастанову аб устаноўцы адначасова 8 помнікаў Леніну, якія павінны былі з'явіцца ў гг. Жабінка, Ляхавічы, Нясвіж, Наваполацк, Сена, гарадскіх пасёлках Дзятлава, Карма і Астравец [12, 14]. У снежні 1988 г. па прапанове Гомельскага і Магілёўскага абкамаў КПБ бюро ЦК КПБ прыняло рашэнне ўзвесці помнікі Леніну ў г.п. Лоеў і г. Слаўгарад. У 1989 г. бюро пастанавіла паставіць аналагічны помнік у Полацку.

У 1989 г. міністэрства займалася распрацоўкай і ўзвядзеннем помнікаў Леніну ў гг. Дзятлава і Полацку [3, 90]. У 1990 г. у БССР у распрацоўцы ці падрыхтоўцы да ўстаноўкі знаходзілася 11 новых помнікаў Леніну. Тагачасная прэса пісала: "Дарэчы,

за ўсю гісторыю беларускай манументальнай Леніняны Камуністычная партыя ні разу не выступала ў якасці заказчыка – грошы заўсёды бралі са сродкаў, якія прызначаліся на культуру (з тых самых 0,7 працэнта рэспубліканскага бюджэту)" [11, 3]. 7 лістапада 1990 г. адбыўся антыкамуністычны мітынг перад помнікам Леніну каля Дома ўрада ў Мінску. Гэты дзень лічаць пачаткам дэленінізацыі на Беларусі. Пасля некалькіх падобных акцый і жнівеньскага путчу 1991 г. мінскія гарадскія ўлады прынялі рашэнне аб дэмантажы помніка перад Домам урада. Зняты з пастамента былі бюсты Маркса і Леніна перад будынкам ЦК, бюст Леніна ў зале пасяджэнняў Вярхоўнага Савета і некаторыя іншыя [4, 14]. З 1991 г. у прэсе ішлі актыўныя дыскусіі аб далейшым лёсе твораў «леніняны». Было падлічана, што па дадзеных на 1989 г. на тэрыторыі Беларусі існавала 369 помнікаў і 173 бюсты У.І.Леніну [15, с. 31]. Неабходна прызнаць, што ў Беларусі ў 90-я гг. XX ст. было дэманціравана не так многа помнікаў Леніну.

Аднак ужо было немагчыма сілавымі метадамі спыніць з'яўленне ў беларускім мастацтве новых тэндэнцый. Разам са звычайнымі ўжо выставамі, прысвечанымі якім-небудзь юбілеям партыі або рэвалюцыі, суседнічалі тыя, што адлюстроўвалі цікавасць беларускіх творцаў да гісторыі краіны, чалавечых каштоўнасцей. У студзені 1990 г. у Мінску ў памяшканні Беларускага навукова-даследчага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі праходзіла дабрачынная выстава прац 9-ці скульптараў, членаў Саюза мастакоў. Большасць твораў, якія былі прадстаўлены на гэтай выставе, адносілася да пачатку 80-х гг. і да гэтага часу не выстаўлялася, знаходзілася у майстэрнях скульптараў. Прычына гэтага – тэматыка гэтых твораў і не зусім «сацрэалістычная» манера іх выканання. Сярод выстаўленых прац былі «Вялікі кумір» і партрэт Ф. Скарыны А. Кузняцова, «Цішыня» А. Мятліцкага, медаль А.Фінскага, прысвечаны К.Каліноўскаму і шмат іншых [16, 44-46].

Менавіта ў гэты час у манументальнай скульптуры Беларусі сталі звяртацца і да вобразаў асабіста беларускай гісторыі. У 1989 г. святкавалася 500-годдзе са дня нараджэння Францыска Скарыны. У рамках падрыхтоўкі да юбілею ў аргкамітэце ўзнікла ідэя стварэння помніка беларускаму першадрукару і надання яго імя адной з мінскіх вуліц [13, 11]. У лютым 1989 г. быў абвешчаны рэспубліканскі конкурс на стварэнне эскізнага праекта помніка Ф.Скарыне ў Мінску, вынікі якога падводзіліся ў красавіку 1991 г. На першы тур конкурсу было прапанавана 22 праекты, а перамог эскіз помніка маладога скульптара А.Дранца. Аднак увесь гэты час у прэсе, грамадстве і органах улады ішлі шырокія дыскусіі наконт месца ўстаноўкі гэтага помніка. [15, 31-32]. Помнік быў устаноўлены толькі ў 2005 г. перад новым будынкам Нацыянальнай бібліятэкі.

У той самы 1989 г. святкавалася і 360-годдзе са дня нараджэння выбітнага культурнага і грамадскага дзеяча, пісьменніка-асветніка Сімяона Полацкага. У гонар гэтай падзеі і з мэтай ушанавання яго памяці бюро ЦК КПБ прыняло рашэнне ўстанавіць яму помнік у г. Полацку. Цікава, што рашэнне аб устаноўцы помнікаў С. Полацкаму і У.І. Леніну прымалася на адным пасяджэнні бюро ЦК КПБ 23 чэрвеня 1989 г. Гэты факт можна лічыць падцвярджэннем супярэчлівасці культурнага жыцця Беларусі часоў перабудовы. З аднаго боку, яшчэ трывалымі былі савецкія традыцыі ў кіраўніцтве сферай культуры, а з іншага боку, адчувалася тэндэнцыя нацыянальна-культурнага адраджэння. Доказам гэтай думкі служыла пастанова, прынятая бюро ЦК КПБ 21 красавіка 1989 г. "Аб увекавечванні памяці Кастуся Каліноўскага, Кірылы Тураўскага, Васіля Вашчылы", якая абвясціла рашэнне ўстанавіць помнікі гэтым дзеячам [14, 7].

Неабходна адзначыць, што па тэматыцы твораў манументальнае мастацтва Беларусі 90-х гг. XX.ст. значна адрозніваецца ад савецкага. У ім з'явіліся новыя тэмы, вобразы, новае стаўленне да гледача. Адной з такіх тэндэнцый з'яўляецца стварэнне твораў паркавай скульптуры (у асноўным у Мінску). Напрыклад, "Дама на лаўцы",

"Прахожы", "Дзяўчынка з парасонам" скульптара У. Жбанава. Цікавасць да падобных твораў з боку ўлады сведчыць аб паслабленні ідэалагічнага зместу ў скульптуры ў сучасным грамадстве. Стварэннем паркавай скульптуры па дзяржаўным заказе ў гэты час займаліся такія маладыя скульптары, як А.Фінскі, В.Слабодчыкаў, А.Чыгрын і інш. Папулярнасць паркавай скульптуры паступова нарастала ў 90-я гг. XX ст., неабходнасць яе з'яўлення зразумелі ўлады некаторых беларускіх гарадоў, асабліва сталічныя. Традыцыя праводзіць скульптурныя пленэры нарадзілася таксама ў др. пал. 80-х гг., пачатак яе паклаў Мінскі пленэр-сімпозіум па скульптуры. Правядзенне скульптурных пленэраў таксама часцей за ўсё мела на мэце ўпрыгожанне гарадоў. Сучаснае манументальнае мастацтва нясе і функцыю ўпрыгожвання горада, стварэння ўтульнай для чалавека жылой прасторы. Скульптура паступова губляе пампезнасць, якая падаўляе чалавека.

Новым накірункам творчасці для беларускіх скульптараў стала рэлігійная тэматыка. Адной з самых таленавітых і значных прац стала бронзавая скульптурная кампазіцыя «Арханге́л Міхаіл перамагае змея», устаноўленая ў 1996 г. каля касцёла святых Сымона і Алены ў Мінску (скульптар І. Голубеў) [6, 172]. Узвядзенне гэтага манумента звязана з ростам ролі рэлігійных аб'яднанняў на Беларусі і паказвала значэнне хрысціянства ў духоўным адраджэнні краіны. Асноўным заказчыкам твораў на хрысціянскія тэмы з'яўлялася каталіцкая царква. Такія творы, як «Іаан Хрысціцель», «Арханге́л Міхаіл», «Зняцце з крыжа», «Распяцце» і іншыя скульптара А.Шомава, «Пакаянне», «Галгофа», «Жонкі-міраносіцы» Н. Апіёк, творы У. Ламейкі, У. Панцялеева, У. Слабодчыкава, А. Мятліцкага, А. Фінскага носяць рысы адраджэння старажытных традыцый увасаблення біблейскіх сюжэтаў. Да старажытных, фальклорных і міфалагічных вобразаў з гэтага часу звяртаюцца многія скульптары [8, 332-334].

У 1996 г. Міністэрства культуры распрацавала «Прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай культурнай палітыкі на 1997 – 2000 гг.», дзе вылучаліся сферы культуры для першачарговага фінансавання. Важная роля адводзілася праектаванню помнікаў дзеячам гісторыі, культуры, навукі і значным гістарычным падзеям. У большасці выпадкаў крыніцай фінансавання вызначаўся мясцовы бюджэт. З'яўленне гэтага дакумента спрыяла больш асэнсаванаму планаванню дзейнасці дзяржавы ў накірунку стварэння помнікаў, мэтанакіраванаму выдзяленню сродкаў з агульнадзяржаўных і мясцовых крыніц фінансавання.

Важную ролю ў рашэнні праблемы ўзвядзення помніка адыгралі мясцовыя раённыя і абласныя ўлады. У 1996-2000 гг. былі ўзведзены наступныя помнікі: Н.Ордзе (г. Іванава, Брэсцкай вобласці), бюсты мастакоў П.Масленікава (Магілёў, 1997) і А.Астаповіча (Мінск, 1997); бюст А.Багдановіча (в. Халопенічы, Крупскі раён, 1997) бюст А.Міцкевіча (Гродна, 1998), помнікі М.Доўнар-Запольскаму (Рэчыца, 1997) і М.Танку (Мядзельскі Раён, 1997). У 1998 – 2000 гг. было ўстаноўлена некалькі помнікаў знакамітым асветнікам Беларусі ва ўнутраным дворыку БДУ, сярод іх помнікі Ф.Скарыне (1998), М.Гусоўскаму (1998), Е.Полацкай (1998), С.Буднаму і В.Цяпінскаму (2000).

Яшчэ адзін помнік Е.Полацкай (скульптар І.Голубеў) быў адкрыты на яе радзіме ў г. Полацку ў верасні 2000 г. Ініцыятарамі ўстаноўкі помніка ў другой палове 90-х гг. часта былі грамадскія арганізацыі, фінансавую дапамогу аказвалі і пасольствы розных краін. Напрыклад, скульптуры Ф.Скарыны і М.Гусоўскага, устаноўленыя ў дворыку БДУ, падараваны універсітэту Мінскім грамадска-асветніцкім клубам "Спадчына", а помнік-храм воінам-інтэрнацыяналістам у Траецкім прадмесці ўзводзіўся пры актыўным удзеле арганізацыі былых удзельнікаў вайны ў Афганістане. Яшчэ адным прыкладам можа служыць адкрыццё мемарыяла ахвярам Халакосту на месцы былога

яўрэйскага гета (адкрыты 10 ліпеня 2000 г. у Мінску). Стварэнне гэтага помніка фінансавалася пры дапамозе шматлікіх грамадскіх арганізацый, Федэрацыі яўрэйскіх абшчын СНД, пасольства Ізраіля ў Беларусі [15, 39-43]. Сустракаюцца прыклады фінансавання помнікаў з крыніц прыватнага капіталу, як было з помнікам Рагнедзе ў Заслаўі (скульпар А.Арцімовіч, архітэктар І.Марозаў) [1, 8-10].

У 1990-я гг. кардынальным чынам змяніліся падыходы да фінансавання ўстаноўкі твора манументальнай скульптуры. Як станоўчую тэндэнцыю можна адзначыць рост цікавасці да манументальнай скульптуры мясцовых уладаў. Калі раней яны былі толькі пасіўнымі выканальнікамі ідэй, якія прыходзілі зверху ці імкнуліся "прабіць" устаноўку чарговага бюста правадыра, каб паднясць свой прэстыж, то пазней яны спрабавалі падкрэсліць гістарычныя і культурныя асаблівасці свайго горада ўстаноўкай помніка знакамітаму земляку. Помнік звычайна ставіўся ў гістарычным цэнтры горада і надаваў яму новы духоўны сэнс: помнік князю Давыду ў Давыд-Гарадку (2000 г., скульптар А.Дранец, архітэктар Л.Левін), помнік святой Сафіі Слуцкай у Слуцку (2000 г., скульптар М.Інькоў, архітэктар М.Лук'янчык), помнік Пятру Мсціслаўцу ў г. Мсціслаўлі (скульптары А.Батвінёнка і А.Чыгрын, архітэктар Ю.Казакова, 2001 г.) [9, 2].

У другой палове 90-х гг. значна аслабеў дзяржаўны кантроль у справе ўстаноўкі манументальнай скульптуры, што часам прыводзіла да з'яўлення ў гарадах твораў, якія мелі недастаткова высокі мастацкі ўзровень. Дарэчы, гэта часта практыкавалася ў савецкія часы, калі гарады і вёскі былі "ўпрыгожаны" вялікай колькасцю зробленых быццам бы па адным не вельмі ўдалым узоры помнікаў Леніна і іншых правадыроў. Мясцовыя ўлады і грамадскія арганізацыі мелі больш магчымасцей фінансаваць устаноўку помнікаў, чым цэнтральныя ўлады. Таму часам яны дзейнічалі ў абыход Міністэрства культуры і Саюза мастакоў, працуючы на прамую са скульптрам. 6 верасня 2000 г. Савет Міністраў РБ зацвердзіў "Палажэнне аб парадку праектавання, стварэння (будаўніцтва), рэканструкцыі і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь", якое было распрацавана Міністэрствам культуры. Кантроль за ўзвядзеннем помнікаў быў ускладзены на прафесіяналаў [5, 6].

Дэмакратызацыя жыцця і атрыманне краінай незалежнасці спрыяльна паўплывала на скульптуру. Менавіта сродкамі манументальнага мастацтва вялося патрыятычнае выхаванне, падкрэслівалася нацыянальная самабытнасць беларускай культуры і гісторыі, чаго не было не толькі ў савецкія часы, але нават і ў перыяд перабудовы. Устаноўка некаторых помнікаў гадамі суправаджалася незгасальнымі спрэчкамі на старонках газет (помнік Ф.Скарыне, храм-помнік воінам-інтэрнацыялістам, мемарыял ахвярам Халакосту ў Мінску). Гэты факт гаворыць аб вялікай значнасці мемарыяльнага мастацтва і скульптуры наогул, яго асобнай ролі ў фарміраванні нацыянальнай годнасці і самасвядомасці.

Літаратура:

1. Артимович А. Заблуждения и удачи // Архитектура и строительство. — 2002. — № 5, С. 7—10.
2. Архіў Міністэрства культуры РБ. Ф. 974, воп. 1, спр. 1875.
3. Архіў Міністэрства культуры РБ. Ф. 974, воп. 1, спр. 1995.
4. Васілеўскі П. Якія словы напішам?.. або Як адрэдагаваць "Манументальны летапіс" // ЛіМ. — 1992. — 1 мая. — С.14—15.
5. Войницкий П. Скульптура в городе. Белорусский опыт последних лет // Архитектура и строительство. — 2002. — № 5. — С. 3—6.

6. Габрусь Т. Genius creature: дух творчасці. Помнікі скульптара Ігара Голубева // Роднае слова. — 1998. — № 4. — С. 164—174.
7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці., Ф. 815, воп. 10, спр. 2864.
8. Жук В.І. Выяўленчае мастацтва // Беларусь на мяжы тысячагоддзяў. — Мінск: Бел Эн, 2000. — С. 321—337.
9. Крэпак Б. Пётр Мсціславец вяртаецца на радзіму... // Культура. — 2001. — 18—24 жн. — С. 2.
10. Кудрэйка А. Помнікі У.І. Леніну // Помнікі гіст. і культ. Беларусі. —1988. — № 1. — С. 15—16.
11. Мастацтва і рынак. Пленум Саюза мастакоў Беларусі // Лім. —1990. — 30 ліст. — С. 3.
12. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ), Ф. 4., воп. 160, спр. 789.
13. НАРБ. Ф. 4, воп. 160, спр. 829.
14. НАРБ. Ф. 4., воп. 160, спр. 939.
15. Прэнц К.У. Асноўныя тэндэнцыі развіцця манументальнай скульптуры Беларусі на сучасным этапе// Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва: навукова-інфармацыйны зб. — 2001. — Вып. 2. — С. 29—52.
16. Пярэрва І. Інтанацыі шчырасці і даверу // Мастацтва Беларусі. —1990. — № 12. —С. 44—46.

## RURAL TOURISM AS A FACTOR OF SOCIAL TRANSFORMATION

J. Majewski
*Agricultural University of Poznan, Agritourism Unit, Poland*

This paper propose to look at rural tourism as a possible engine for local development.

It is the primary purpose of developing tourism: to be a source of employment and income. But rural tourism goes far beyond that aim giving other beneficial effects, which can be seen as secondary but have great importance to transformation.

The paper focuses on the following aspects. First, strategies and concepts of rural development and the place of rural tourism in them. Second, different (direct and non direct) benefits from rural tourism, which stimulate change of rural world. Third, some examples of arguments from Poland achievements in rural tourism.

WHY RURAL AREAS NEED TRANSFORMATION ?

Rural Poland is a remarkable survival; it still reflects past times, past life styles, values and cultures, past markets and a past world. In eastern part of the country it is a complex living museum with great national, ecological and heritage value. But it is under serious threat of destruction, as powerful global forces bring new trends in farming, food and marketing. Like rural regions and lifestyles in other countries, Poland's countryside may lose its rich regional identities and values. It is already losing many of its young people to city regions [5, 9].

Poland's rural world is at a turning point – it faces the need to refresh and renew and build on its past – or lose its significance. The paper concentrates on the development of rural tourism, not to replace farming but to complement it, and to help introduce new ideas and income streams as a catalyst for rural economic, social and cultural regeneration. Sustainable rural tourism has become a key ingredient in modern rural development in many parts of the developed world.

Most of European states experienced a 40-70% reduction in their agricultural workforce.

Countries in central and eastern Europe have been also treated as being in "transition" or "transformation". Transition is a term employed (not always consciously) to represent a prescriptive set of uni-linear conceptual attitudes which locate the shift away from central